# Рэспубліка Беларусь прадставіць нацыянальны стэнд на міжнароднай выставе Bakutel 2018.

З 4 па 7 снежня ў г. Баку пройдзе 24-я Азербайджанская міжнародная выстава і канферэнцыя «Тэлекамунікацыі, Інавацыі і Высокія Тэхналогіі» Bakutel 2018. Чакаецца, што ў гэтым годзе выстава збярэ больш за 200 кампаній з 20 краін.

Актыўны ўдзел у працы Bakutel 2018 прыме дэлегацыя Рэспублікі Беларусь, якую ўзначальвае міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін Шульган.

У маштабнай экспазіцыі Bakutel 2018 прадстаўлены Нацыянальны стэнд Рэспублікі Беларусь, дзе свой патэнцыял і тэхнічныя рашэнні прадэманструюць дзевяць беларускіх кампаній: РУП «Белтэлекам», РУП «Белпошта», ААТ «Гіprасувязь», ААТ «Прамсувязь», НІРУП «Інстытут прыкладных праграмных сістэм» , РУП «Нацыянальны цэнтр электронных паслуг», РУП «Нацыянальны цэнтр абмену трафікам», навукова-вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «навукова-даследчы інстытут тэхнічнай абароны інфармацыі», Установа адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія сувязі». Госці і ўдзельнікі выставы таксама змогуць пазнаёміцца з магчымасцямі СТАА «Беларускія хмарныя тэхналогіі».

Удзел у выставе дазволіць прадэманстраваць дасягненні і патэнцыял Рэспублікі Беларусь у сферы высокіх тэхналогій, абмеркаваць перспектыўныя мадэлі супрацоўніцтва і важныя напрамкі сумеснай работы ў інавацыйнай сферы. Акрамя таго, удзел у выставе стане яшчэ адным крокам да ўмацавання ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў галіне сувязі і інфарматызацыі.

ДАВЕДАЧНА
Bakutel - гэта не проста выстава ў сферы тэхнічных дасягненняў, гэта ўнікальная пляцоўка, дзе збіраюцца прафесіяналы розных сфер ІКТ, якія прапануюць шырокія магчымасці і самыя апошнія распрацоўкі для ўсіх сфер дзейнасці.

Афіцыйную падтрымку выставе аказвае Міністэрства Транспарту, Сувязі і Высокіх Тэхналогій Азербайджанскай Рэспублікі, ITU - Міжнародны саюз электрасувязі, Рэгіянальная Садружнасць у галіне Сувязі (РСС), Агенцтва Развіцця Малога і Сярэдняга Бізнесу Азербайджанскай Рэспублікі, Фонд Заахвочвання Экспарту і Інвестыцый у Азербайджане (AZPROMO) і Нацыянальная канфедэрацыя Прадпрымальнікаў (Працадаўцаў) Арганізацый Азербайджанскай Рэспублікі. Арганізатарам выставы з'яўляецца кампанія Caspian Event Organisers. Генеральным спонсарам выставы выступае кампанія Azercell Telecom, пастаянны ўдзельнік выставы.

Сярод удзельнікаў - вядучыя ІКТ-кампаніі, мабільныя аператары, інтэрнэт-правайдэры, сістэмныя інтэгратары, дыстрыб'ютары вядомых брэндаў і маладыя распрацоўшчыкі. Выстава Bakutel 2018 прадэманструе нацыянальныя стэнды такіх краін, як Італія, Іран, Турцыя, ААЭ, Рэспубліка Беларусь, ЗША, Славенія, Францыя, Харватыя, удзел якіх рэалізуецца пры актыўнай падтрымцы Міністэрства Транспарту, Сувязі і Высокіх Тэхналогій Азербайджанскай Рэспублікі.

**Source URL:** *https://www.xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/04-12-2018-3781*